# ФАКТАР КУЛЬТУРЫ МУЗЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ Ў ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ

**Б.А. Галяшэвіч**

У перыяд каардынальных рэфармацый сацыяльнага жыцця востра паўстае пытанне абароны і развіцця культурных асноў і духоўнай сферы грамадства, набытых папярэднімі пакаленнямі. Сучасны гістарычны момант характарызуецца пераацэнкай духоўных каштоўнасцей. Як сведчыць уся папярэдняя гісторыя існавання грамадства - нельга ў адно імгненне адмовіцца ад усяго таго, што набывалася дзесяцігоддзямі. Фактар нашага нетрывалага эканамічнага жыцця значна зменшыў духоўныя патрэбы насельніцтва і моладзі ў прыватнасці. Спакуса камерцыйнага абагачэння прэвалюе ў свядомасці і ўчынках падрастаючага пакалення. Прыватны бізнес ускружыў свядомасць маладых людзей з аднаго боку, а дзяржаўнае бяссілле ў матэрыяльнай падтрымцы інтэлігенцкага асяроддзя з другога боку, прывялі да ўпаду м а с а в у ю культуру. Вядома, што духоўная дэградацыя грамадства рана ці позна прыводзіць да фізічнага тормазу ў яго развіцці ўвогуле. Усведамленне гэтай аксіёмы ў многім спрыяла стварэнню мноства сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў з мастацкім ухілам. Але пры росце такіх устаноў колькасць іх выпускнікоў, жадаючых працоўжыць павышэнне свайго ўзроўню ў ВНУ з тым жа профілем, змяншаецца. Школы ці гімназіі з мастацка-эстэтычным ухілам арыентуюць вучняў перш за ўсё на атрыманне прафесійнай падрыхтоўкі, што, бясспрэчна, садзейнічае росту культуры сярод грамадства. Між тым, галоўная роля ў выхаванні падрастаючага пакалення належыць усё ж такі сярэдняй агульнаадукацыйнай школе.

Вялікія выхаваўчыя магчымасці ў маральным, культурным і мастацка-эстэтычным сэнсе заключае ў сабе ўрок музыкі. Гэта, безумоўна, асноўная крыніца масавага музычнага выхавання. Цяперашні этап развіцця грамадства патрабуе ад музычнай асветы выпрацоўкі навукова абгрунтаванай методыкі ўспрымання музычных твораў, якая б улічвала змены грамадскага жыцця і адпавядала рэаліям сучаснасці. На жаль, час вымушае ўносіць карэктывы ў існуючую праграму па музыцы для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, распрацаваную Д.Б. Кабалеўскім, у сувязі з увядзеннем дзяржаўнасці беларускай мовы, прыдбаннем рэспублікай статусу дзяржавы і, увогуле, пераасэнсаваннем самога складу жыцця. Але, што датычыць асноўных структурных момантаў і логікі падбору музычнага матэрыялу, то ўсё па-ранейшаму адпавядае патрэбам мастацка-эстэтычнага выхавання дзяцей і ў наш час. Мы маем на ўвазе ў першую чаргу сувязь музыкі і жыцця, тэматычнае пастраенне музычнага матэрыялу, цэласнасць урока, апору на інтанацыйную аснову музычнага мастацтва, успрыманне музыкі, як асноўнага віду дзейнасці на ўроку музыкі.

Вакол апошняга тэзісу сярод музыкантаў-педагогаў вядзецца шмат палемікі як аб месцы катэгорыі ўспрымання ў музычнай педагогіцы наогул, так і аб паняцці адэкватнасці музычнага ўспрымання. Што павінен разумець пад гэтым настаўнік



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

музыкі ў першую чаргу? Прымаць за адэкватнасць музычнага ўспрымання супадзенне вобразных уяўленняў слухача з вобразнымі ўяўленнямі кампазітара, ці з аб'ектыўным гучаннем музычнага твору, што зусім не адно і тое ж. У навуковай літаратуры існуе многа процілеглых меркаванняў і ў адносінах абавязковасці або непажаданасці прысутнасці ў слухачоў жыццёвых правобразаў наогул у працэсе ўспрымання музыкі. Наўрад ці з гэтай праблемы магчыма нейкае ўніверсальнае выйсце з-за яе адносін да глыбокіх псіхічных з'яў. Напрыклад, ёсць аўтары, якія абмяжоўваюцца канстатацыяй самога факта прысутнасці, або адсутнасці вобразных уяўленняў слухача пры ўспрыманні музыкі (Л.С. Выгоцкі; Я.У. Назайкінскі; Г.І. Панкевіч; С.Я. Фейнберг) . Другія з даследчыкаў апраўдваюць наяўнасць зрокавых правобразаў пры слуханні праграмнай музыкі, і ўказваюць на недапушчэнне іх прысутнасці пры ўспрыманні непраграмнай музыкі (Н.Л. Гродзенская; Г.М. Кечхуашвілі). Але ёсць і трэцяя катэгорыя музычных даследчыкаў, з думкай якіх нельга не згадзіцца. Іх падыход да разглядаемай праблемы заключаецца ў прызнанні факта прысутнасці зрокавых асацыяцый іманентным працэсу музычнага ўспрымання (А.Р. Касцюк; В.Д. Астраменскі; Г.С. Тарасаў; У.М. Гурко.). Інакш кажучы, музычнае мастацтва ствараецца кампазітарамі і выканаўцамі, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі чалавечага грамадства, выразнікамі духоўнага і матэрыяльнага яго міру сродкамі музыкі. Гэтыя абставіны прыводзяць да вываду, што дэтэрмінаванасць узнікнення асацыятыўных вобразаў у слухачоў закладзена ўжо ў самім паходжанні стваральнікаў музыкі, іх прыналежнасці чалавецтву. Такім чынам, нельга ўявіць музыку, створаную дзеля музыкі, адорваную ад зямнога жыцця, дзякуючы якому яна ўбачыла свет. Калі такая музыка і з'яўляецца, напрыклад, у стылі алеаторыкі, яна не атрымлівае належнага прызнання слухачоў і асуджана на хуткае забыццё. Мэтазгоднасць і агульнае прызнанне музычнага мастацтва як раз і заключаецца ў тым, каб спрыяць вобразнай фантазіі слухача і накіроўваць яго свядомасць праз інтраспектыўныя перажыванні да катарсіснага стану. Сутнасць заключаецца ў тым, што пры гучанні якой музыкі асацыятыўныя правобразы апраўданы і наколькі мастацкі і эстэтычна афармлены. У гэтым сэнсе існуе неабходнасць антрапамарфізацыі працэса ўспрымання праз суадносіны гучання музыкі з узвышанымі пачуццямі чалавека, накшталт: спачуваннем, жалем, смуткам ці вяселлем і г.д. Пытанне асацыятыўнасці набліжае нас да вельмі важнай у музычнай педагогіцы катэгорыі культуры музычнага ўспрымання.

Так ці інакш, любы від музычнай дзейнасці (спевы, рух, імправізацыя і інш.) непазбежна дэтэрмінаваны ўспрыманнем музыкі. Сама па сабе катэгорыя музычнага ўспрымання носіць даволі шырокі і недастаткова вызначаны сэнс. Яна не дае магчымасці высвятлення ўзроўняў прыёму музычнай інфармацыі слухачом. Такія абставіны ў сваю чаргу вядуць да немажлівасці вызначэння прыярытэтнага напрамку і этапных рубяжоў у музычным выхаванні дзяцей. А адсутнасць такіх рубяжоў і канчатковай мэты наогул можа аказваць свой негатыўны ўплыў на выбар метадычных сродках у музычна-эстэтычным выхаванні дзяцей.

У навуковай літаратуры вызначаны тры асноўныя перыяды ў жыцці чалавека, якія адрозніваюцца паміж сабой яскравасцю вобразных асацыяцый пры слуханні музыкі. Дзіця, якое не валодае дастатковым аб'ёмам жыццёвага вопыту, неабходнага для

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

правядзення паралеляў паміж музыкай і рэчаіснасцю, добра рэагуючае на знешнія раздражняльнікі і, у прыватнасці, на музыку, не абцяжарана ўсё ж такі наяўнасцю зрокавых правобразаў пры слуханні музычных твораў. Гэты пачатковы перыяд у развіцці чалавека, які характарызуецца адсутнасцю вобразных уяўленняў, назавём умоўна "даасацыятыўным". З накапленнем жыццёвага вопыту і ўдасканальваннем свядомасці дзіця пачынае разумець, што музыка існуе не сама па сабе, а цесна пераплецена з жыццём людзей. Паступовае знаёмства з некаторымі агульнымі ведамі пра музычнае мастацтва наступае ўсведамленне музыкі як носьбіта сэнсу і выразчыка чалавечых пачуццяў. У гэты час актывізуецца патрэба ў пошуку падтэкстнай старонкі музыкі, яе змястоўнасці. Гэтыя абставіны і характарызуюць наступленне асацыятыўнага перыяду ў музычнай эвалюцыі слухача. Жыццёвыя правобразы ў гэты час маюць станоўчы эфект, выконваючы ролю каталізатара, стымулюючага ўспрыманне музыкі. Наступны этап удасканальвання ўспрымальных магчымасцей чалавека, як адзначае большасць даследчыкаў, мае тэндэнцыю да зніжэння зрокавай асацыятыўнасці. Аднак, прыняць такі вывад за заканамернасць можна толькі ўмоўна. Назіранні Г.С. Тарасава яскрава пацвярджаюць гэта, калі ён высвятляе парадокс у прыхільнасці прафесійных музыкантаў, прычым вышэйшай кваліфікацыі, да "летуценнасці пад музыку", да слухання эстэтычна каштоўнай музыкі ў час дзейнасці зусім немузыкальнай.

Магчымасць дыферэнцыяцыі слухачоў і больш эфектыўнага педагагічнага ўздзеяння на працэс слухання дае, на наш погляд, катэгорыя **к у л ь т у р ы м у з ы ч н а г а ў с п р ы м а н н я**. Па азначэнню А.Р. Касцюка: "...гэта структурна-функцыянальная яго арганізацыя, якая абумоўлівае якасць дэкадзіроўкі музычна-эстэтычнай інфармацыі ў той меры, у якой гэта якасць залежыць ад узроўню музычна-перцэптыўнага развіцця ўспрымальніка"[1]. Працэс успрымання з'яўляецца актам пазнання, які знаходзіцца заўжды ў прагрэсіруючым стане на працягу ўсяго свядомага жыцця чалавека. Лагічна меркаваць, што з цягам часу, накапленнем жыццёвага вопыту акт успрымання індывідумам музыкі "акультурваецца". Гэты працэс можа працякаць адвольна, без імператыўнага знешняга ўздзеяння. Разам з тым ён адбываецца намнога эфектыўней, калі выпрацавана метадычная сістэма і канцэптуальна вызначаны апорныя рычагі педагагічнага ўплыву на яго.

Вялікія магчымасці ўтрамлівае ў сабе методыка музычнага выхавання, заснаваная на знаходжанні суадносін музычнай і моўнай інтанацыі. Апалагет інтанацыйнай тэорыі музычнага мастацтва Б.У. Астаф'еў лічыў, што музыку нельга ўспрымаць інакш, як толькі інтанацыйна. З'яўляючыся вельмі часта адлюстраваннем менавіта матэрыяльнага міру, інтанацыя дапамагае пазбавіцца сумнення аб натуральнасці і нават непазбежнасці прысутнасці апрадмечаных асацыяцый пры слуханні музыкі.

Аналіз навуковай літаратуры і практычная эксперыментальная работа дазваляюць выдзеліць некалькі фактараў, якія аказваюць асаблівы ўплыў на паспяховасць музычна-эстэтычнага выхавання дзяцей. Гэта апора на інтанацыйную аснову музычнага мастацтва; метадычна-мэтанакіраваны мастацка-педагагічны аналіз музычнага твору; улік жыццёвага вопыту і эстэтычных патрэб дзяцей. Асабліва неабсяжныя магчымасці змяшчае ў сабе патрэба. Дзякуючы ёй, вучня можна правесці па шляху



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад музыкі папулярнай, якая пераважна даспадобы большасці моладзі, да паўпапулярнай і ад яе да шэдэўраў сусветнай музычнай культуры. Падбор музыкі для слухання, якая адпавядае эстэтычным патрэбам дзяцей, будзе спрыяць актуалізацыі іх мастацка-вобразных уяўленняў, вызначаючых культуру музычнага ўспрымання.

*Літаратура*

1. Касцюк А.Р. Культура музычнага ўспрымання. У кн. "Мастацкае ўспрыманне", Л., "Навука", 1971.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова